вым дадаткам (сцэнарыі, запрашальныя білеты, рэклама, водгукі гледачоў і г.д.).

На наш погляд, такая структура арганізацыі і правядзення практыкі з'яўляецца найбольш аптымальнай і дае магчымасць студэнтам рэалізаваць свае прафесійныя веды, уменні і навыкі, атрыманыя ў працэсе навучання ў Беларускім універсітэце культуры.

М.А.Каралькоў,
прафесар Беларускага універсітэта культуры

## СПЕЦЫФІКА ПРАКТЫКІ НА ФАКУЛЬТЭЦЕ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

Падрыхтоўка ў вышэйшых навучальных установах высокакваліфікаваных спецыялістаў шырокага профілю, якія спалучаюць фундаментальныя веды з практычнымі ўменнямі і навыкамі і могуць хутка адаптавацца на месцы працы пасля заканчэння вучобы, самастойна папаўняць свае веды, развіваць уменні ў канкрэтнай вобласці, — актуальная праблема сённяшняга часу. Паспяховае яе рашэнне шмат у чым залежыць ад арганізацыі вучэбнага працэсу, ад таго, наколькі формы і метады навучання задавальняюць патрабаванням мэтавай падрыхтоўкі студэнтаў да вытворчай дзейнасці, і ў немалай ступені ад таго, як арганізавана вытворчая і педагагічная практыка студэнтаў.

Адукацыя студэнтаў на факультэце мастацкай творчасці Беларускага універсітэта культуры мае сваю спецыфіку. Спецыфіка менавіта ў тым, што студэнты факультэта атрымліваюць не адну, а, як правіла, дзве і больш кваліфікацый.

Па-першае, наш выпускнік набывае кваліфікацыю кіраўніка мастацкага калектыву, і ў гэтым сэнсе ён павінен мець глыбокія веды па спецыяльных дысцыплінах, а па-другое, пасля заканчэння універсітэта ён атрымлівае кваліфікацыю выкладчыка спецыяльных дысцыплін.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выходзячы з гэтага і ажыццяўляецца арганізацыя і правядзенне практыкі на факультэце. З аднаго боку, гэта вытворчая практыка, на працягу якой удасканальваюцца веды і ўменні, атрыманыя пры вывучэнні дысцыплін спецыяльнага цыкла, а з другога боку, педагагічная практыка дае магчымасць праверыць тыя тэарэтычныя веды па псіхолага-педагагічных дысцыплінах, якія студэнт набыў падчас вучобы.

На факультэце мастацкай творчасці выкарыстоўваюцца наступныя базы правядзення вытворчай практыкі: прафесійныя калектывы, мастацкія калектывы буйных клубных устаноў, вучылішчы мастацтваў, ліцэі, сярэднія школы з музычна-эстэтычным ухілам і інш.

Правядзенне вытворчай практыкі дазваляе атрымаць адказ на пытанне: "Які сёння патрэбен спецыяліст у галіне мастацкай культуры?" Праходжанне вытворчай практыкі дае магчымасць удасканаліць вучэбныя планы, звярнуць увагу на сучасныя праблемы. Акрамя таго, мы атрымліваем інфармацыю не толькі аб тым, чаму вучыць, але і як вучыць. Гэта тычыцца і рэпертуарнай палітыкі, і аранжыровак, і інструментовак, і пастановкі тых ці іншых танцаў.

Педагагічную практыку студэнтаў факультэта мастацкай творчасці звычайна разглядаюць у кантэксце агульнай прафесійнай падрыхтоўкі. Базамі практыкі пры гэтым выступаюць музычныя школы, харавыя студыі, агульнаадукацыйныя школы, школы з музычным, харавым, харэаграфічным ухілам, гімназіі, вучылішчы мастацтваў, музычны ліцэй, музычныя вучылішчы і каледжы. Таму авалоданне тэхналогіяй выхавання вучняў сродкамі пэўнага віду мастацтва немагчыма без глыбокага ведання тэарэтычных дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла, такіх, як агульная, сацыяльная, узроставая псіхалогія і педагогіка мастацкай творчасці. Але ж вядома, што тэарэтычныя веды па прадметах псіхолага-педагагічнага цыкла павінны спалучацца з практыкай. Таму важна ўдасканальваць методыку выкладання спецыяльных дысцыплін. На наш погляд, выкладчы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кам методыкі трэба вельмі адказна аднесціся да распрацоўкі праграм методыкі выкладання спецыяльных дысцыплін і можа нават рабіць гэта сумесна з кафедрай педагогікі і псіхалогіі.

Але каб гэты механізм запрацаваў на карысць студэнтаў, трэба на кожнай кафедры прызначыць лепшых выкладчыкаў, адказных за вытворчую і педагагічную практыку. Менавіта кіраўнік практыкі арганізоўвае эфектыўнае праходжанне практыкі, ажыццяўляе пастаянны кантроль за праходжаннем практыкі згодна вучэбнаму плану, ажыццяўляе праверку дзённікаў, праводзіць кансультацыі, аказвае неабходную дапамогу.

Трэба адзначыць, што наспела неабходнасць абмеркавання магчымасці арганізацыі базы практыкі ва універсітэце шляхам стварэння дзіцячых музычных, харэаграфічных студый, а таксама накіроўваць лепшых студэнтаў для праходжання вытворчай і педагагічнай практыкі ў мастацкія калектывы Беларускага універсітэта культуры. Думаю, што лепшыя студэнты V курса маглі б паспяхова праходзіць і педагагічную практыку са студэнтамі, напрыклад, I курса.

**А.А.Караткевіч,**
**ст. выкладчык Беларускага універсітэта культуры**

## АСНОЎНЫЯ ФОРМЫ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ КАФЕДРЫ ДУХАВОЙ МУЗЫКІ

Важнейшым звяном у сістэме падрыхтоўкі кіраўнікоў духавых аркестраў і ансамбляў з'яўляецца вытворчая практыка. У ходзе яе студэнты набываюць практычныя навыкі работы з калектывам, развіваюць арганізатарскія, педагагічныя, творчыя здольнасці. Асабліва каштоўна, што ў час практыкі студэнты набываюць магчымасць прымяніць свае веды і ўменні як у кіраванні калектывам (развучванне твораў, правядзенне рэпетыцый, канцэртных выступленняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ